паэзія

Людка Сільнова



...мне родныя, хто з найярчэйшых:
я – не з тутэйшых...

# Паміж маланкаю і громам

## ВЫКЛІК ВЯСНЫ

*I*
Качкі як смочкі:
Плывуць па вадзе
Й рухам ствараюць
Абрысы грудзей –

Сьветлых, жаночых
І трапяткіх –
На гнуткім целе
Роднай ракі.

*II*
Небу насустрач,
У тысячы тон

Рака расхінула
Адзежы бетон.

«Досыць чаканьня», –
Шэпча яна...
Пахне гразёю.
Гэта вясна!

***III***
Я нахілюся
Праз парапет.
Зрокам накрэсьлю
Літару зэт.

Хай гэта чара
І нас не міне:
Шал адраджэньня!
Помста зіме!

## ПАДРЭЗАЛА КОСЫ ВЯРБА

Навошта была варажба
На мове, на словах рудых?
Падрэзала косы вярба
(Вяшчуньня, а сёньня раба):
Ёй гвалтам падрэзалі іх.

Зіма, наступае зіма.
Хапае за горла мароз.
Як скіўіцы зводзіць хурма!
У парку – здаюць дацямна
Студэнты бязьлітасны крос.

Як сьмешна гучыць: «Барацьба!»
Або: «Не забудзем мы іх!..»
Падрэзала – косы – вярба.
І зносіць рачная вада
Старое аблічча – усіх!

## ПАМІЖ МАЛАНКАЮ І ГРОМАМ

Паміж маланкаю і громам
Мяне хвалюе невядомасьць.
А як ня вернецца дадому

Абрынуты – у нерухомасьць! –
Наш сьвет? І попелам маёмасьць
Паробіцца ў далоньцы кволай?..
І срэбнай лужынай сьвядомасьць –
Гадзіньнік дзён – сьцякае долу.

## СОНЦУ

Цябе шукаць –
І цябе ***траціць***, мілы,
Адкуль узяць,
Адкуль мне чэрпаць сілы?

Я толькі шкла
Маленькага аскепак:
Жыву, жыла,
Ці буду жыць, ня ведаю...

Вось – узышло
Чарговы раз ураньні
Тваё сьвятло
Маёй пякучай тайнай!

Вятры малю,
Цьвярдзеючы ў малітве,
Каб не ў ральлю,
І не – у гразь пры бітве…

## ПАДАРУНАК ВОСЕНЬНЮ

***I***
«Што – найлепшы падарунак? –
Думала я раніцай. –
Цэлафанавы пакунак?
Пачак аблігацыяў?

Можа, цацачнай жывёлы
Мяккая сінтэтыка?..
Толькі ўжо ня вершык кволы:
Шорсткая патэтыка!»

***II***
Лісьцік жоўты на парозе
Павуціненьне сонейкам.

Непрыкметна ў госьці восень
Завітала сёньнека.
Можа, мне яна падкажа,
Проста і нязмушана,
Што за падарунак ляжа –
Лепшым! – пад падушкаю?..

***III***
Спатыкаюся, блукаю
Па кватэры ўласнае,
У пакоях здань шукаю,
Жоўтую, прыўкрасную.

Вось, на гэтым крэсьле, пэўна,
Побач з кававаркаю...
Не пачвара – каралеўна,
Бульбу есьць са скваркамі!

## ЗВАРЫЦЬ КАВЫ

Намялю я духмянай кавы.
«Як умееш ты быць ласкавай!..»

Усьміхнуся, паружавею:
«Але гэта ўсё, што я ўмею...»

## НАЗІРАЛЬНІЦА

Я не імкнуся стаць сьвядомай –
Мне дастаткова невядомай.

Я не імкнуся стаць праграмнай –
Мне дастаткова беззаганнай.

Мая жыцьцёвая задача –
На бале людскім быць нябачнай.

Не правадыр. Не карыстальніца.
Я – назіральніца.

(Мне родныя, хто з найярчэйшых:
Я – не з тутэйшых.)